# ЧАЛАВЕК І МАСТАЦТВА

Мастацкі дух ніколі не памрэ.
Не пахаваць яго пад курганамі,
Не вычарпаць гадамі і вякамі.

*Алесь Дудар*



Пры вывучэнні раздзела:

✓ **пазнаёмімся** з асаблівасцямі некаторых фальклорных твораў; будзем раскрываць сэнс народных параўнанняў і ўстойлівых выразаў;

✓ **будзем вучыцца** фармуляваць тэму і асноўную думку твораў; вызначаць адносіны аўтара твора да падзей і герояў.

**Варта задумацца.** У чым чарадзейная сіла мастацтва? Навошта чалавеку мастацтва?



Правообладатель Академия образования

## *У свеце прыгожага*

1. Разгледзьце рэпрадукцыю нацюрморта Уладзіміра Хадаровіча.



2. Адкажыце на пытанні.

1) Што такое нацюрморт? Назавіце прадметы, з якіх складаецца нацюрморт.

2) Якія віды мастацтва ўвасабляюць гэтыя прадметы? (Для даведкі: *музыка, жывапіс і графіка, мастацкая літаратура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, скульптура*.)

3) Што, на ваш погляд, могуць сімвалізаваць на карціне скрыпка, ручнік і збанок з саламянымі кветкамі?

4) Якія віды народных рамёстваў прадстаўлены ў нацюрморце?

5) Прыдумайце сваю назву гэтай карціне. Чаму вы далі б ёй такую назву?

6) Якія ўражанні выклікаў у вас гэты твор жывапісу?

**Успомніце.** Якія беларускія народныя і аўтарскія песні вы ведаеце з урокаў літаратурнага чытання і музыкі? Праспявайце асобныя з іх. Якую ролю, на вашу думку, адыгрывае ў жыцці чалавека песня? Паразважайце.

## Адкуль песня беларуская

*Легенда*

Ці то полем, ці то лесам ішлі тры падарожнікі. Ішлі яны тры дні і тры ночы ды яшчэ паўдня. Прыталіліся. Прыселі. Раптам чуюць — спявае нехта. Прыслухаўся першы:

— Відаць, жаваранак.

— Не, — кажа другі, — гэта лес шуміць.

А трэці прыпаў вухам да зямлі і прашаптаў:

— Ды гэта ж зямля наша спявае.

*Пафантазіруйце.* Прыдумайце працяг легенды. Што, на вашу думку, на самай справе спявала?

?

1. Што нагадала пачутая мелодыя першым двум падарожнікам?
2. Як вы разумееце словы трэцяга падарожніка — «зямля наша спявае»?
3. Адкажыце, адкуль песня беларуская.



Правообладатель Академия образования

## *У свеце прыгожага*

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны беларускага мастака Міхаіла Савіцкага «Калыханка».



2. Адкажыце на пытанні.

1) Хто паказаны на карціне?

2) Якія прадметы сведчаць, што перад намі жанчына-беларуска?

3) Які ў яе настрой? Чаму вы так думаеце?

4) Што за рэчы знаходзяцца побач з жанчынай і дзіцём? Для чаго выкарыстоўвалі людзі ў даўнія часы драўлянае вядро і калыску?

5) Чаму, на вашу думку, жанчына адлюстравана на фоне печы?

6) Які настрой выклікала ў вас карціна Міхаіла Савіцкага «Калыханка»? Чаму?

**Стра́та** — пазбаўленне чаго-небудзь, прапажа, згуба.

## Народ і песні

*Анатоль Грачанікаў*

Вякамі стра́ты лічыла
Айчына мая, Айчына.
Як бы ні бедавала,
А песні яна спявала.

Як кажуць сярод людзей,
Без песні — няма надзей.
Народ без песні — не ўмее,
Народ без песні — нямее.

Без песень свайго народа
Нямее нават прырода.
Ты любіш народ свой і край?
Песні яго спявай!

Вякамі раны лячыла,
Айчына мая, Айчына.
Змагалася, ваявала,
А песні ўсё ж спявала.



**1.** Растлумачце сэнс радкоў:
- Вякамі стра́ты лічыла
  Айчына мая, Айчына;
- Вякамі раны лячыла,
  Айчына мая, Айчына;
- Без песні — няма надзей.
  Народ без песні — не ўмее,
  Народ без песні — нямее.



Правообладатель Академия образования

2. Чаму «без песень свайго народа нямее нават прырода»?
3. Паразважайце, дзякуючы каму беларуская песня жыве, не знікае.
4. Да чаго паэт заклікае чытача? Ці згодны вы з думкай аўтара?
5. Якую беларускую народную ці аўтарскую песню вы ведаеце на памяць, любіце спяваць? Паспрабуйце праспяваць яе.

Кожны год на старажытнай віцебскай зямлі праходзіць Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар». Гісторыя яго ўзнікнення пачынаецца з 1992 года.

У праграму фестывалю ўключаны розныя жанры музыкі, тэатра, кіно, выяўленчага мастацтва і народныя рамёствы. Дэвіз фестывалю: «Праз мастацтва да міру і ўзаемаразумення». Эмблемай міжнароднага свята з’яўляецца васілёк, стылізаваны пад ноту до. Кветка сімвалізуе чысціню і хараство Беларусі.

У межах фестывалю праводзіцца Міжнародны дзіцячы музычны конкурс «Віцебск».

Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар» стаў важнай дзяржаўнай справай і штогод атрымлівае падтрымку з боку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Урада краіны.

## У свеце прыгожага

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Віктара Маркаўца «Свята ў Докшыцах».



2. Адкажыце на пытанні.

1) Якое свята адлюстраваў мастак на карціне? Якія прадметы сведчаць, што гэта Купалле?

2) Па чым можна меркаваць, што падзеі, паказаныя на карціне, адбываюцца ў Беларусі?

3) Які выраз твару ў дзяўчыны і юнака на пярэднім плане? Чаму, на вашу думку, яны сур'ёзныя, задуменныя?

4) Што ў руках у дзяўчыны і ў хлопца? Аб чым гэта сведчыць?

5) Які настрой выклікала ў вас гэта карціна? Чаму?

6) Падбярыце іншыя назвы да гэтага твора жывапісу.



Правообладатель Академия образования